адукацыі, можа з'явіцца асновай да вылучэння асобнага курса.

Самастойная работа студэнтаў прадугледжвае тры напрамкі іх працы:

- на аўдыторных занятках;
- у пазааўдыторны час;
- пад кантролем выкладчыка.

На аўдыторных занятках самастойная работа студэнтаў прадугледжвае развіццё творчых здольнасцей і актыўнай мысліцельнай дзейнасці. Так, у лекцыі-дыялогу ставяцца пытанні, на якія навучэнцы могуць адказаць, карыстаючыся ведамі, набытымі ў вучылішчы. Гэта абмеркаванне пытанняў аб структуры дзіцячых аматарскіх аб'яднанняў, прынцыпах падбору рэпертуару з улікам узросту дзяцей і інш.

У лекцыі неабходна перанесці акцэнт з інфармацыйнага навучання на метадалагічнае. Гэта дапаможа студэнтам самастойна зрабіць абагульненне перадавога вопыту педагогаў-хормайстраў, іх тэарэтычных распрацовак, вылучаць для сябе найбольш зразумелы шлях у вакальным выхаванні дзяцей.

Перспектыўнай формай развіцця самастойнасці студэнтаў з'яўляецца арганізацыя творчай работы пад кіраўніцтвам выкладчыка, якая праходзіць у працэсе аўдыторных і пазааўдыторных заняткаў.

Да практычных заняткаў распрацаваны творчыя і кантрольныя заданні для самастойнай падрыхтоўкі. Яны складзены з улікам папярэдняй падрыхтоўкі студэнта, даступныя для навучэнцаў з рознымі здольнасцямі. Гэтыя заданні дапамогуць выкладчыку своечасова выявіць у студэнта ступень авалодання матэрыялам.

Такім чынам, можна зрабіць вывад аб тым, што выкарыстанне указаных напрамкаў у арганізацыі самастойнай работы студэнтаў у раздзеле "Методыка работы з дзіцячым хорам" дазволіць павысіць эфектыўнасць і якасць прафесійнай падрыхтоўкі, будзе садзейнічаць фарміраванню навыкаў самастойнай працы, дапаможа арганізаваць індывідуальны падыход у навучанні.

Леановіч З.Л.,
дацэнт

# НЕКАТОРЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ЎЗАЕМАСУВЯЗІ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ПРАДМЕТАЎ У ПРАЦЭСЕ ПАДРЫХТОЎКІ ВЫКЛАДЧЫКА ХАРАВЫХ ДЫСЦЫПЛІН

Прафесійная дзейнасць любога педагога ўключае веданне свайго прадмета і валоданне комплексам педагагічных навыкаў.

Гатоўнасць да музычна-педагагічнай дзейнасці прадугледжвае шырокую музычную адукацыю, валоданне спецыяльнымі выканальніцкімі навыкамі (дырыжорскімі, вакальнымі, фартэпіяннымі), захапленне харавым мастацтвам, веданне псіхалагічных заканамернасцей развіцця вучняў і валоданне педагагічнымі уменнямі. Усе гэтыя якасці фарміруюцца пры вывучэнні прадметаў музычнага і псіхолага-педагагічнага цыклаў.

Эфектыўнасць і якасць падрыхтоўкі спецыялістаў залежаць ад узаемасувязі, пераемнасці ў вывучэнні дысцыплін, ад таго, наколькі правільна вызначаны кафедрамі месца і роля той ці іншай дысцыпліны ў агульнай сістэме вучэбнага працэсу. Кожны выкладчык павінен бачыць мэту выкладання свайго прадмета не абстрактна, а ў агульнай структуры падрыхтоўкі спецыяліста.

У харавым класе, які заўсёды быў цэнтрам навучання харавых дырыжораў, выхоўваюцца тонкі слых, пачуццё рытму, уменне слухаць сябе, другія галасы і г.д.

На харавых занятках на практыцы пазнаюцца сэнс і значэнне вакальных практыкаванняў, работы над гукам, над дыханнем, значэнне вакальнай работы, якая з'яўляецца асновай харавых спеваў, выпрацоўваюцца дырыжорскія навыкі.

Адной з вядучых дысцыплін у працэсе падрыхтоўкі выкладчыкаў харавога мастацтва з'яўляецца дырыжыраванне. Гэта комплексная дысцыпліна заснавана на глыбокіх музычна-тэарэтычных ведах, якія набываюцца на занятках па спецыяльных прадметах.

Самастойнае знаемства студэнта з творам па дырыжыраванні ажыццяўляецца шляхам прайгравання яго на фартэпіяна. Студэнт, які не валодае інструментам, практычна не здольны да самастойнай работы па дырыжыраванні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Працуючы над харавым творам, неабходна знаёміцца з творчасцю кампазітара, сальфеджыраваць галасы.

У працэсе работы над харавымі партыямі педагог накіроўвае слыхавую ўвагу студэнта на свядомае інтанаванне партый, сочыць за яго дыханнем, артыкуляцыяй, якасцю гука. Такім чынам адбываецца ўзаемасувязь з сальфеджыо і вакалам. У работу над партытурай уваходзіць вакальна-харавы, гарманічны і структурны аналіз твора. У гэтай сувязі асаблівае значэнне маюць курсы гармоніі, сальфеджыо, аналізу форм, хоразнаўства.

Сістэма арганізацыйных форм і метадаў навучання, якая выкарыстоўваецца ў класе дырыжыравання, павінна быць накіравана на фарміраванне і развіццё музычна-педагагічных здольнасцей студэнтаў, іх самастойнасці і гатоўнасці да выкладчыцкай дзейнасці.

З першых курсаў у працэсе навучання неабходна ствараць умовы для самастойнай работы студэнтаў. Адным са сродкаў, якія стымулююць творчае мысленне, з'яўляюцца пісьмовыя аналізы твораў, што вывучаюцца ў класе.

Мэтай вучэбнага працэсу павінна быць не толькі засваенне ведаў, але і ўменне выкарыстаць гэтыя веды ў практычнай дзейнасці.

У кожнай вучэбнай дысцыпліне неабходна вызначыць не толькі аб'ём тэарэтычных ведаў, але і практычныя навыкі. Менавіта яны фарміруюць прафесійныя навыкі, самастойнасць мыслення.

Міжпрадметныя сувязі як сістэма адносін паміж ведамі, уменнямі і навыкамі павінны забяспечыць актывізацыю самастойнай работы студэнтаў, якая з'яўляецца вядучым відам іх дзейнасці ў ВНУ. Вельмі важным вынікам умення студэнтаў працаваць самастойна з'яўляецца павышэнне іх матывацыі ў авалоданні прафесіяй.

Жураў А.В.,
дацэнт

## ЗНАЧЭННЕ АЎФТАКТА Ў ХАРАВЫМ МАСТАЦТВЕ

Са з'явай аўфтакта нам часта даводзіцца сустракацца ў сваёй штодзённай працоўнай дзейнасці. Прызвычаіўшыся да яго, мы нават не заўважаем і не вылучаем яго з агульнага працэсу. Так, напрыклад, каб кінуць на нейкую адлегласць прадмет, мы спачатку павінны замахнуцца. Ад сілы замаху будзе залежыць хуткасць руху і далёкасць палёту прадмета. Тут мы робім фізічнае намаганне "замах", які і будзе нічым іншым, як аўфтактам.

Пры неабходнасці зрабіць сумеснае, групавое фізічнае намаганне звычайна кажуць: "Раз...два...узялі!" Аўфтактам тут з'яўляецца "два", а "раз" -- падрыхтоўкай да яго.

Часта пры рабоце ў музычных калектывах мастацкай самадзейнасці кіраўнік карыстаецца гукавым сігналам "і" ці "два", які з'яўляецца ў данным выпадку аўфтактам, прадвесцем будучых калектыўных дзеянняў. Такім жа гукавым сігналам з'яўляецца і адстукванне дырыжорам лікавых долей нагой ці рукой, вымаўленне ліку ўслых. Усе гэтыя сігналы з'яўляюцца прадвеснікамі будучых дзеянняў калектыву выканаўцаў.

У працэсе дырыжыравання замест гукавых пабуджальных сігналаў ужываюцца зрокавыя, заснаваныя на ўспрыманні фізічных дзеянняў, у дадзеным выпадку рухаў рук. Гэтыя пабуджальныя сігналы, заключаныя ў жэсце, заўсёды павінны выконвацца строга ў часе, які адпавядае тэмпу твора ці асобных яго частак, музычных фраз і г.д. Жэст, які нясе ў сабе пабуджальныя сігналы да дзеяння і зроблены строга ў неабходным часе з зададзенай мэтай, з'яўляецца аўфтактам.

Паколькі аўфтакт заўсёды накіраваны на падрыхтоўку будучага гучання, функцыя прадвяшчання выяўляецца ў ім з асаблівай вастрынёй і канцэнтраванасцю. Таму, натуральна, у яго аснове і будзе заўсёды паскораны рух, які адрозніваецца спецыфічнай пабуджальнасцю, імпульсіўнасцю. Гэты рух і адрознівае яго (аўфтакт) ад іншых дырыжорскіх рухаў, ён называецца імпульсам.

Імпульс у аўфтакце канцэнтруе ўвагу выканаўцаў і дае загад, штуршок да дзеяння. Імпульсіўнасць паскоранаму руху ў аўфтакце надаюць дзве акалічнасці. Па-першае, ён мае рэзкі характар за кошт пунктаў, што яго абмяжоўваюць. Па-другое, паскораны рух у аўфтакце займае мінімальна магчымы час, што прымушае выканаўцаў кантраляваць увагу. За кошт сціскання часу і акцэнтавання пунктаў рух набывае характар актыўнага паскарэння да "мэты" і таму эфектыўна выконвае функцыю прадвяшчання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ